## Захар Шыбека, *Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет*, Вільня 2009, 372 с.

Стварэнне аб'ектыўнай гістарычнай і сучаснай панарамы гарадскога жыцця Беларусі належыць да ліку адной з самых актуальных і важных задач гістарычнай навукі. Праца доктара гістарычных навук, прафесара, вядучага спецыяліста па гісторыі гарадоў і ўрбанізацыі Захара Шыбекі* „Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет", што ўбачыла свет у 2009 г. у выдавецтве Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, з'яўляецца першай спробай паказаць працэсы ўрбанізацыі і станаўлення гарадской цывілізацыі ў Беларусі ў агульнасусветным кантэксце.

Кніга з'яўляецца вынікам шматгадовага досведу даследаванняў аўтарам сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Мінска і гарадоў Беларусі другой паловы XIX — пачатку XX стст., беларускага нацыянальнага руху ў XIX-XX стст., вытокаў, ходу і вынікаў працэсаў урбанізацыі беларускага грамадства.

Праца мае вучэбны характар (на вокладцы пазначана *вучэбна-метадычны дапаможнік*, на тытуле — *курс лекцый*). Пры яе напісанні выкарыстанае шырокае кола крыніц і літаратуры, пра што сведчаць змястоўныя спісы бібліяграфіі пасля кожнага падраздзела. Аўтарам улічаны асноўныя дасягненні айчыннай і замежнай гістарыяграфіі праблемы урбаністыкі. Пры гэтым праца З. Шыбекі носіць выразна наватарскі і арыгінальны характар, што праяўляецца як у яе форме, так і ў змесце.

Зараджэнне, развіццё і перспектывы гарадской цывілізацыі ў Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі свету разглядаюцца праз раскрыццё трох ключавых праблем, што адбілася на структуры кнігі, якая складаецца з трох раздзелаў: „Горад", „Урбанізацыя", „Гараджане".

* Захар Шыбека, доктар гістарычных навук (1998), прафесар (2003), працаваў настаўнікам у школе (1972-1974), навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1974-1991), кіраваў аддзелам беларусазнаўства Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны (1991-1998), займаў пасаду дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (1999), выконваў абавязкі галоўнага рэдактара часопіса „Спадчына" (2001-2002), з 1999 — на выкладчыцкай працы: займае пасаду прафесара ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце і Еўрапейскім гуманітарным універсітэце, з'яўляецца куратарам аддзялення найноўшай гісторыі ў Беларускім калегіуме. Аўтар кніг „Минск в конце XIX — начале XX в.: Очерк социально-экономического развития" (1985), „Минск: страницы жизни дореволюционного города" (1990, у сааўтарстве), „Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзяў)" (1997), „Historia Białorusi" (Lublin 2002), „Dejiny Beloruska" (Praha 2006, у сааўтарстве), „Нарыс гісторыі Беларусі. 1795-2002" (2003), „Мінск сто гадоў таму" (2007), „Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет" (2009); больш як 200 артыкулаў і рэцэнзій. Праца па гісторыі Беларусі XIX — пачатку XXI ст. адзначана прэміяй польскага часопіса „Przegląd Wschodni" ў 2001 г. і прэміяй імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра ў 2003 г.

Першы раздзел адлюстроўвае праблемы тэрміналогіі і гістарыяграфіі, паказвае генезіс і асноўныя этапы ў гістарычным развіцці гарадоў свету і Беларусі. Матэрыял пра гарады свету выступае ў якасці ўводзін, агульнага фону для разгляду айчынных гарадскіх цэнтраў. Гісторыя гарадоў Беларусі і свету выкладзеная храналагічна, паралельна і параўнальна. Праблемы сучаснасці гарадоў Беларусі паказаныя з рэтраспекцыямі ў мінулае і ў кантэксце сусветных працэсаў. Аўтар не пакінуў па-за сваёй увагай і мястэчкі, выказаў шэраг цікавых назіранняў пра ролю і спецыфіку гэтых пераходных паміж вёскай і горадам паселішчаў (с. 62, 89-91, 120-121, 123-124).

Другі раздзел кнігі прысвечаны разгляду сусветнай урбанізацыі і месца ў ёй Беларусі. Урбанізацыя даследуецца тут у сувязі з развіццём эканомікі і гарадской культуры, узаемаадносінамі вялікіх і малых гарадоў і дамінуючай роллю сталіцы. Знаёмства з гэтай часткай працы дае ўяўленне пра ўрбанізацыю як найважнейшую грамадскую з’яву і яе асаблівасці на беларускіх землях; уклад горада ў эканамічны прагрэс; станаўленне і ролю беларускай сталіцы; праблемы правінцыйнага гарадскога жыцця; дазваляе зразумець як урбанізацыя ўплывала на духоўна-культурную місію горада.

Неабходна падкрэсліць асабліва наватарскі характар матэрыялу лекцыі 8-й: „Гарадская культура і гарадскі турызм”. У айчыннай гістарыяграфіі аддаецца перавага вывучэнню сацыяльна-эканамічнай гісторыі нашых гарадоў. Пра культуру гарадоў пішуць зрэдку. На старонках гэтай часткі кнігі З. Шыбека вызначае ролю горада ў развіцці культуры, характарызуе ўмовы развіцця культуры ў гарадах Беларусі, разважае над праблемамі культурнага развіцця сучасных гарадоў свету і Беларусі. А што датычыць турызму, то З. Шыбека ці не ўпершыню ў краіне падняў праблему развіцця ў Беларусі гарадскога турызму, якім дагэтуль усур’ёз ніхто не займаўся, бо стаўка робіцца менавіта на сельскі турызм. Падраздзел кнігі „Гарадскі турызм” утрымлівае матэрыял па гісторыі турызму ў Беларусі, адлюстроўвае турыстычны патэнцыял гарадоў Захаду і Беларусі, указвае на канкрэтныя шляхі развіцця айчыннага гарадскога турызму.

У апошнім раздзеле кнігі аўтар разглядае такія аспекты, як ментальнасць гараджан, гарадскі камфорт, гарадское самакіраванне і горадабудаўнічая палітыка. Чытач мае магчымасць атрымаць уяўленне пра гараджаніна як спецыфічную папуляцыю на Зямлі. Уздымаецца праблема гуманізацыі гарадскога асяроддзя і праблема гарадской экалогіі ў сувязі з нарастаннем працэсаў глабалізацыі. Паказваецца ўплыў гарадскога асяроддзя на ментальнасць гараджан у працэсе іх стваральнай дзейнасці. Разглядаюцца асаблівасці фармавання і дзейнасці гарадскога самакіравання, яго ўплыў на эканамічнае і культурнае жыццё га-

раджан. Звяртаецца ўвага на эстэтыку гарадскога асяроддзя (архітэктура, плошчы, паркі і г.д.) і неабходнасць захавання яго гармоніі ў працэсе гарадскога будаўніцтва і выпрацоўкі новай гарадской палітыкі.

Удалая структура, добра падабраны матэрыял, які спалучае высокі тэарэтычны ўзровень, арыгінальнасць разважанняў аўтара, багатую і цікавую факталогію, значны аб'ём тэкстаў 12-ці лекцый (па 30-40 старонак кожная) дазваляюць дастаткова ўсебакова і глыбока раскрыць такую маштабную тэму, як станаўленне і развіццё гарадской цывілізацыі ў Беларусі і свеце. Вывучэнне гісторыі і сучаснасці гарадской цывілізацыі ў Беларусі праведзенае не толькі ў кантэксце сусветнай гісторыі, але таксама на аснове інтэрдысцыплінарнага падыходу: выкарыстання дасягненняў такіх навук, як гісторыя, сацыялогія, культуралогія, геаграфія, эканоміка.

Праца З. Шыбекі пакідае станоўчыя ўражанні не толькі ад свайго высокага навуковага, але і навучальна-метадычнага ўзроўню. Тэксты лекцый, з якіх яна складаецца, забяспечаныя неабходным вучэбна-метадычным матэрыялам: планамі тэм, метадычнымі парадамі па іх вывучэнню, спісамі літаратуры, пытаннямі і заданнямі для абмеркавання. Усё вылучаецца глыбокай прадуманасцю і скрупулёзнай прапрацоўкай.

Аўтару ўдалося рэалізаваць задачу, акрэсленую ў прадмове наступным чынам: „(...) будзьма разважаць над праблемамі гарадской цывілізацыі разам" (с. 5). Сапраўды, падручнік пабудаваны так, што дапамагае не толькі здабываць новыя веды, але і думаць падчас навучання — ацэньваць мінулае і сучаснае, аналізаваць падзеі і працэсы ў Беларусі і свеце.

Усё вышэйадзначанае, разам з удала падабраным стылем працы, робіць вывучэнне складанай і шматграннай праблемы ўрбанізацыі ў Беларусі і свеце прыемным і захапляльным працэсам.

У прадмове да кнігі З. Шыбека падкрэслівае, што яго аўтарскую версію станаўлення і развіцця гарадской цывілізацыі ў Беларусі часам варта аспрэчваць (с. 5). Сапраўды, некаторыя палажэнні яго канцэпцыі з'яўляюцца дыскусійнымі. У прыватнасці, выклікае пэўныя сумненні прапанаваная ў 1-й лекцыі перыядызацыя гісторыі гарадоў Беларусі, у якой скарыстаны пераважна дзяржаўніцкі крытэрый. Храналагічнай мяжой паміж трэцім (часы ВКЛ) і чацвёртым (часы Рэчы Паспалітай) этапамі развіцця гарадоў Беларусі выступае Люблінская ўнія (с. 22). Узнікае пытанне: ці настолькі істотна ў 1569 г. змянілася функцыянаванне нашых гарадоў? Больш значнымі ўсё ж былі змены, выкліканыя распачатымі ў сярэдзіне XVII ст. войнамі, што пацвярджаецца і матэрыяламі наступных лекцый, змешчаных у працы. Варта б было адлюстраваць гэта і ў перыядызацыі гісторыі нашых гарадоў.

Праца прафесара Захара Шыбекі „Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет" выклікае вялікую цікавасць як сярод спецыялістаў, так і шыро-

кага кола чытачоў, з'яўляецца значным укладам у беларускую гістарычную навуку і адукацыю. Яна дапамагае зразумець горад як гістарычную з'яву з толькі яму ўласцівымі рысамі; спрыяе вывучэнню працэсаў урбанізацыі ў Беларусі ў кантэксце ўрбанізацыі сусветнага маштабу і ў цеснай узаемасувязі з усімі грамадскімі працэсамі, што мелі месца на кожным этапе гістарычнага развіцця; знаёміць з асаблівасцямі разнастайнай жыццядзейнасці гараджан. Кніга знаходзіць шырокае выкарыстанне пры выкладанні курсаў і спецкурсаў па айчыннай гісторыі, беларусістыцы і эканоміцы горада ў ВНУ (у прыватнасці, з дапамогай яе вывучаюць спецкурс „Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі" студэнты факультэта гісторыі і сацыялогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы). З упэўненасцю можна сказаць, што праца Захара Шыбекі паслужыць абуджэнню цікавасці маладых даследчыкаў да праблем урбаністыкі.

**Іна Соркіна**
(Гародня)